Opłata pocztowa uiszczona ryczałtem.

№ 2 (110) Нядзеля 22-га студзеня 1928 г. м. Вільня. Год III.

БЕЛАРУСКАЕ СЛОВА

Выходзіць … Цана нумару 20 грош.

Нацыянальнае ад… …ая і культурна-нацыянальная аутаномія.—Зямля сялянам на падставе уласнасьці.—Шырокі дэмакратызм.— … Нацыянальная царква.—Краевая згода. —Далучэньне Усходняй Беларусі да Заходняй

Падпісная цана на 1 месяц 1 зл.
" " 3 " 2 зл.
Заграніцу ўдвая даражэй.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Wilno ul. Zawalna 6 m. 4
Рэдакцыя адчынена ад 12—2 гадз. штодня апрача сьвятаў.

Цана абвестак: На 1 старане —20 гр.
" У тэксце . —40 гр.
" На 4 старане —15 гр.
За кожны мілім. шырыны ў 1 шпальту.
Старана мае 8 шпальтаў.

Да Беларуск. Грамадзянства!

БЕЛАРУСЫ!

4 і 11 сакавіка адбудуцца выбары да Сойму і Сэнату. Гэтыя выбары будуць мець вялізарнае значэньне для Беларускага Народу, бо новае Беларускае Соймавае прадстаўніцтва пры новым курсе палітыкі ўраду маршалка Пілсудзкага **можа зрабіць многа** для Беларускага Народу.

Дык першым Вашым абавязкам ёсьць іесьці ўсім на выбары — як старым, так і маладым, мужчынам і кабетам.

Усе да урнаў 4 і 11 сакавіка!

Тым болей трэба дружна, **валам** іесьці на галасаваньне, што Беларусы разьбіліся на тры галоўныя групы, а значыць разабьюцца і галасы выбаршчыкаў; дык **кожны голас дарагі!**

Якія-ж гэта групы і за каго павінен галасаваць беларускі выбаршчык?

Першая група — гэта б. Грамада. Але старыя беларускія правадыры, як Тарашкевіч, Рак-Міхайлоўскі ўжо не стаяць на чале гэтай групы — яны у турме, роўным чынам як і многа сялян. На чале новай Грамады стаяць якіясь нікому невядомыя Пекач, Бэрнт і Юхно...

Дык ці можа быць сумліў у тым, што беларускае сялянства, якое гэтулькі **перанясло** і цяпер яшчэ пераносіць **гора і сьлёз** ад палітыкі Грамады, — **ня дасьць ані воднага голасу за рэвалюцыйна-падпольную Грамаду!**

Бо хто-ж яшчэ верыць у тое, што Грамада сама **раздасьць усю зямлю сялянам?** Хто верыць, што прыдуць бальшавікі з Менску і зробяць у Заходняй Беларусі Работніцка-Сялянскую Савецкую Ўладу?...

Хто верыць усім байкам, якія апавядаюць пра „рай“, пра „свабоду“ і „дабрабыт“ у Саветах, калі нават сваіх былых галоўных правадыроў і „герояў“ — Троцкага, Зіноўева і іншых лікам 56 чалавек Сталінская камуністычная банда высяляе ў Сыбір?

А хто ня ведае аб тым, што ў Усходняй Беларусі **нашая беларуская** з я м л я раздаецца жыдоўскім каляністам, а беларусоў перасяляюць у Сыбір?...

Дык аніводны голас за бальшавіцка-пралетарскую здрадніцу Беларускага Народу б. Грамаду, якая перафарбавалася ў **„Беларускае Работніцка-Сялянскае Аб'яднаньне“** з неведамымі якімісь Пекачамі, Юхнамі і Бэрнтамі!

Другой групай, якая ідзе на беларускую вёску, зьяўляецца гэтак добра ведамы „Сельсаюз“ Рагулі і Ярэміча. Ідуць яны пад гучнай назвай „Беларускага Аб'яднанага Выбарнага Камітэту“. У гэтым „аб'яднаным“ камітэце, апрача кучкі Рагуль-Ярэміцкіх сельсаюзнічкаў, знаходзіцца яшчэ група беларускіх хадэкаў, але без... павадыроў — ксяндзоў, якім духоўнай ўладай забаронена іесьці на выбары. Для паўнаты букету сюды далучыліся два сябры (бо больш няма!) „Праваслаўнага Дэмакратычнага Аб'яднаньня“ адлучаныя ад Царквы б. сэнатар Багдановіч і сьвяшчэньнік Голад. У гэтым-жа „аб'яднаньні“ знайшоў ціхі куток адзіны з грамадаўскіх паслоў Сабалеўскі, які **з няведамых** прычынаў застаўся на волі. Праўда сяляне на зьездзе „Сель-Саюзу“ адкрыта кідалі яму ў вочы абвінавачаньне ў тым, што ён здраднік Грамады і сваіх Соймавых таварышаў, і што зрабіў гэта ён, каб злавіць ізноў „мандацік“... Вось і ўсё „аб'яднаньне!“

Гэтае „аб'яднаньне“ заместа пайсьці на заклік нашага Камітэту, як гэтага трэбавалі іх-жа выбаршчыкі на зьездзе (28 сьнежня ў Вільні), зьедналіся фактычна і шчыра з „праўдзівымі абаронцамі беларускага селяніна і сельзаюзьніцкай ідэолёгііі...“ з жыдоўскімі фабрыкантамі (Шэрэшэўскі і інш.) і сыяністамі!..

Яны проста запрадалі за грошы жыдоўскім фабрыкантам беларускія мандаты. Яны прадалі тое, **чаго ня мелі права прадаваць!**

Але гэтага мала. Пэўныя ў тым, што за грошы можна ашукаць беларускую вёску, яны ўжо падзялілі мандаты, зразумела выключна паміж сваіх блізкіх партыйных людзей.

Гэтая подлая прадажа беларускіх мандатаў адбылася ў той час, калі жыдоўскія паслы, якія і ў папярэдніх выбарах адтрымалі шмат мандатаў беларускімі галасамі (прыклад з Наваградчыны, дзе жыды агідна ўкралі два мандаты ад беларусоў у папярэднім Сойме, **нарушыўшы падпісаную ўмову!**) і здрадзілі наагул беларусоў у Сойме, за што два гады назад тыя-ж самыя Сельсаюзьнікі і бел. хадэкі страшэнна лаялі жыдоў у „Сель-Ніве“ і „Крыніцы“ (глядзі гэтыя газэты за 1925 год).

Нарэшце на чале сьпіскаў гэтага блёку меншасьцяў стаяць вядомыя „абаронцы сялян“ п. Ярэміч і Рагуля.

Яны 5 галоў крычэлі, што трэба дамагацца зямлі бясплатна, а самі... **купілі** сабе: Ярэміч добры дамок з пляцам і садам (пад самай Вільняй), а Рагуля зямелькі і сенажаці! А што яны далі народу? Нічога! Дык ці ж упадзе хоць адзін голас на гэтых здраднікаў інтарэсаў Беларускага Народу, на гэтых шкурнікаў і — фарысеяў, гэтых запрадаўшыхся парабкоў жыдоўскіх фабрыкантаў?

Не! Ні на Рагулю і Ярэміча, ні на іх служак, а тым балей **на жыдоўскіх фабрыкантаў і сыяністаў** у гэтым годзе **ўжо не ўпадзе ані водзін Беларускі голас!**

Усе галасы павінны ўпасьці на адзіны Беларускі Нацыянальны сьпісак, які выстаўляе „Цэнтральны Агульна-Беларускі **НАРОДНЫ** Камітэт“!

У гэты Камітэт уваходзяць прадстаўнікі беларускіх культурных, грамадзкіх, самаўрадавых і палітычных нацыянальных беларускіх арганізацыяў: 5 з Вільні і 30 з правінцыі, ў тым ліку 20 радных, гэтых праўдзівых выбранцаў сялянства.

Наш Камітэт ёсьць адзіны, які будзе выстаўляць кандыдатаў з паветаў і праўдзівых, шчырых, умяркаваных беларускіх дзеячоў бяз рожніцы, ці гэта селянін з ролі, ці прадстаўнік беларускай працоўнай інтэлігэнцыі.

Кандыдатаў будуць вызначаць паветы!

Дык Беларусы—выбаршчыкі! Галасуючы за наш сьпісак, Вы ня толькі будзеце пэўны, што галасуеце за **адзіны беларускі нацыянальны сьпісак,** але што Вы будзеце галасаваць **за сваіх ВАМІ** выстаўленых **кандыдатаў.**

Беларусы — выбаршчыкі! У гэтых днях усюду па местах і вёсках пачнуць працаваць ужо зарганізаваныя акружныя, паветовыя, раённыя і гмінныя камітэты „Цэнтральнага Агульна-Беларускага **НАРОДНАГА** Выбарнага Камітэту“, да якіх зварачвайцеся за ўсялякімі інфармацыямі, літэратурай і г. д.

Памятуйце, Беларусы — выбаршчыкі, што ізноў Вас, як у 1922 годзе, будуць лавіць на шырокія праграмы, на гучныя лёзунгі, на пекныя абяцанкі. Гэтак рабілі „Вызваленцы“, гэтак робяць „Сель.-Саюз“ і „Грамада“. Ня верце гэтым праграмам, а верце толькі людзям, якім Вы давераеце і якіх Вы самі паставіце ў сьпіскі.

Дык усе як адзін ідзіце з сваімі галасамі да адзінага Беларускага **НАРОДНАГА** Камітэту! Ад гэтага залежыць пасьпех наш на выбарах, у гэтым залог нашай лепшай **будучыні!**

ЦЭНТРАЛЬНЫ АГУЛЬНА-БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ ВЫБАРНЫ К-Т.

Палітычны агляд.

Мінуўшы год заставіў у насьледзтва бягучаму году нявырашанаю адну з найбольш трудных праблем — гэта

праблему міра і разбраеньня,

над якою напрасна ламаюць галовы сьвятовыя палітыкі і дыплёматы ўжо дзесяць гадоў. Зусім зразумела, што ў вырашэньні гэтай праблемы найбольш зацікаўлены дзяржавы — пераможцы, для якіх карысна было-бы сахраніць поўнасьцю здабычы апошняй сьвятовай вайны. І асабліва ў гэтым зацікаўлена Францыя, якая чакае рэваншу з боку Нямеччыны і якая зьнемагае ад цяжару ваеннай гатоўнасьці. Вось дзеля чаго француская дыплёмацыя ўвесь час занята шуканьнем тых шляхаў, якія дазволілі бы Эўропе захаваць мір і прэдатвраціць нават лёкальныя аружныя спатычкі, якія лёгка могуць перайсьці ў агульную свалку.

Адным з гэткіх шляхаў, выбраным Брыянам, зьяўляецца

Лекарнскі дагавор,

дазваляючы ўладжываць мірнымі спосабамі канфлікты між д з я р ж а в а м і падпісаўшымі гэты трактат. Але сярэдне-Эўропэйскае Лёкарно, як ведама, не абхоплівае ўсіх дзяржаваў, маючых паважную ваенную вартасьць. У склад яго не ўваходзяць Амэрыка, Радавая Расея, Японія і іншыя дзяржавы. Былі спробы пашырыць гэты дагавор і на іншыя дзяржавы шляхам стварэньня гэтак званых гарантыйных дагавораў, але яны дадатковых вынікаў не далі. Спробы Радавай Расеі акружыць сябе персьцянем гэткіх дагавораў зусім не гарантуюць Эўропе таго міру, якога жадаюць пераможцы, бо бальшавікі, як ведама, па самай сваей натуры зьяўляюцца ворагамі ўсялякага міру. Самі яны баяцца ўвязвацца ў вайну, ведаючы добра, што яна прыблізіць канец іх дыктатарскага панаваньня ў Расеі. Але вайна і непаразуменьні між іншымі дзяржавамі толькі ўзмацняе іх уладу.

Другім чынікам, стаячым на варце агульнагв міру, зьяўляецца

Ліга Народаў.

Гэта ўжо больш выпрабаваны апарат і ахопліваючы большы лік дзяржаваў, даходзячы да 53. Але і ў ім ёсьць вялікая шчыліна, бо яна неахапляе Злучаных Штатаў і Радавай Расеі, якія ня хочуць уваходзіць у яе склад па асабістым эгоістычным поглядам. Бальшавікі байкатуюць Лігу Народаў, як хаўрус антыбальшавіцкіх буржуазных дзяржаваў дзеля той простой прычыны, што іх мэтаю зьяўлеяцца падрыхтоўка сьвятовай рэвалюцыі, ад якой яны ня могуць адрачыся. Уступленьне-ж у Лігу Народаў зьвязала-бы іх па рукам. Што ж датычыць Злучаных Штатаў, дык яны наагул ня хочуць зьвязваць сябе якімі-бы та ні-была забавязаньнямі, каб не абмежаваць свабоды дзейства на выпадак вайны між іншымі дзяржавамі, ведаючы добра, якія карысьці дала ім Эўропэйская вайна (ўсе Эўропэйскае золата за пяць гадоў вайны перайшло да Амэрыкі). А калі-б Амэрыка ўваходзіла ў склад Лігі Народаў, дык у выпадку ўзбройнага канфлікту між сябрамі Лігі прыйшлося-бы вінаватую старану байкатаваць, дзякуючы чаму пацярпелі-бы гандлёвыя інтарэсы Амэрыкі. Амэрыканцы-ж народ практычны. Для іх, як і для іх крэўных—англічан, уласныя інтарэсы перш-на-перш. Пасьля гэтага будзе зусім зразумела, дзеля чаго Амэрыка ўвесь час стаіць паодаль ад Лігі Народаў.

Яшчэ ў мінуўшым годзе Брыян зьвярнуўся да Амэрыкі з прапазыкаю заключэньня з Францыяй вечнага міру. Вашынгтон цэлы год чакаў з адказам і толькі на гэтых днях даў адказ Францыі, які зусім сьцьвярджае тыя меркаваньні, якія мы толькі што выказалі. Амэрыка кажа, што яна згадзілася-бы на гэткі мір з Францыяй, калі-б яго можна было распаўсюджыць на ўсе іншыя дзяржавы, ведаючы добра, што гэта недасягаемая мэта. Гэткім чынам спроба Францыі прыцягнуць Амэрыку якім-колячы спосабам да супрацоўніцтва ў справе агульнага міру пацярпела поўнае фіяско. А між тым цяжар узбраеньня прадаўжае руйнаваць гаспадарку дзяржаваў—пераможцаў.

Калі глянем на стан узбраеньня пасьля вайны і параўнаем яго з даваенным часам, дык убачым, што

сьвятовая вайна зусім не аблягчыла цяжару агульнага ўзбраеньня.

Паводле даных, сабраных Лігаю Народаў, у цяперашні момант

у Эўропе пад ружжом знаходзіцца 3,2 мільена чалавек.

У гэты лік не ўваходзяць ні сілы паліцыі (ў Нямеччыне 150,000 чалавек з ваеннай арганізацыяй), ні жандармэрыя, ні тэрытэр'яльныя дывізыі чырвонай арміі, ні розныя поўваенныя арганізацыі, якія ў Нямеччыне дасягаюць да мільёна, а мо і больш, польскі „Стралок“ больш 300,000, фашыстаўская італьянская міліцыя і іншыя.

Калі параўняць гэтую лічбу ў 3,2 мільёна войска Эўропы ў 1927 г. з 3,5 мільёнамі, быўшымі ў 1913 г., дык атрымаем розьніцу ў 300,000 чалавек, ці цяперашні стан вааружэньня быццам на 10% меншы даваеннага. Але гэта толькі так здаецца.

Перш-на-перш трэба мець на ўвазе, што ў 1913 г. тры цэнтральныя дзяржавы — Нямеччына, Аўстра-Вэнгрыя і Баўгарыя мелі 1,300,000 войска, а цяпер яны маюць толькі — 160,000. Значыць рэшта дзяржаваў Эўропы павялічылі свае збройныя сілы на 800,000 у параўнаньні з даваенным часам. Гэты ўзрост вааружэньня прыходзіцца галоўным чынам на новаствораныя дзяржавы, як Польшча (300,000), Чэха-Славакія (120,000), Балтыйскія Рэспублікі (100,000) і іншыя.

Гэткім чынам, параўняўшы ўзбраеньне Эўропы 1913 і, 1927 г. мы бачым наступную разьніцу: раней Эўропа была вааружана ад ног да галавы, але раўнамерна, а цяпер адна част ка дзяржаваў, як Нямеччына, Аўстрыя, Вэнгрыя і Баўгарыя, вааружаны стасункова слаба, а рэшта дзяржаваў, як Францыя, Польшча і іншыя, вааружаны значна больш, чым у 1913 г. Вось некалькі лічбаў, даючых малюнак гэтага нераўнамэрнага цяжару вааружэньня:

У 1927 г. пад ружжом стаяла: ў С.С.Р.Р.—1,050,000 чал., Францыі 730,000, Італіі—325,000, Англіі (без калёніяў)—310,000, Польшчы 300,00, ЮгаСлавіі—150,000, Румыніі —140,000, Чэха-Славакіі — 120,000 і Нямеччыне—100,000.

Выдаткі на гэтыя арміі складалі наступны процант агульна-дзяржаўных выдаткаў: у С.С.Р.Р. — 14,5%, Францыі— 18%, Італіі —

Перад выбарамі да Сойму і Сэнату.

Выбарны календар.

24 студня. Падача дзяржаўных сьпіскаў кандыдатаў.

26 студня. Участковыя выбарчыя камісіі адсылаюць да акружных камісіяў па два экзэмпляры выбарчых сьпіскаў.

30 студня. Участковыя выбарчыя камісіі прыймаюць дадатковыя запярэчаньні проці выключэньня каго — небудзь з выбарчага сьпіску і перасылаюць іх да акружных выбарчых камісіяў.

АБВАДОВЫЯ ВЫБАРНЫЯ КАМІСІІ Ў ВІЛЕНСКІМ ВАЯВОДЗТВЕ.

У Віленскім ваяводзтве адчынена 512 абвадовых (раённых) выбарных камісіяў:

63 выбарчы вокруг: м. Вільня — 58, Віленскі-Троцкі пав. — 95.

64 Выбарчы вокруг: Сьвенцянскі пав.— 51, Браслаўскі — 87, Пастаўскі 36, Дзісьненскі 70.

65 Лідзкі выбарчы вокруг: Ашмянскі пав. 36, Вялейскі 48, Маладэчанскі 31.

ПЕРШЫЯ ДЗЯРЖАУНЫЯ СЬПІСКІ.

У апошнія дні былі пададзены да Галоўнае Дзяржаўнае Выбарнае Камісіі пяць першых выбарных сьпіскаў. У зьвязку з гэтым у панядзелак адбылося паседжаньне Галоўнай Выбарнай Камісіі. Да гэтага часу былі прадстаўляны наступныя сьпіскі:

№ 1. — Безпартыйны блёк супрацоўніцтва з урадам.

№ 2 — Польская сацыялістычная партыя.

№ 3 — Вызваленьне.

№ 4 — Жыдоўскі работніцкі „Бунд“.

№ 5 — Жыдоўскі работніцкі „Поалей-Сыён“, лявіца.

Да 24 гэтага месяца, г. ё. да апошняга тэрміну складаньня выбарных сьпіскаў усялякія пэрсанальныя перамены у сьпісках дапускаюцца.

12 студзеня паступіў да Галоўнай Выбарнай Камісіі сьпісак № 6 Украінскага Нацыянальнага Саюзу, на чале якога стаіць д-р Даніловіч. Гэта арганізацыя, працуючая у Прыкарпатах і займаючая адносна Польскае Дзяржавы і Ураду лёяльную пазыцыю.

13 студзеня паступіў да Галоўнай Выбарнай Камісіі сьпісак N. P. R. № 7.

14 студзеня паступілі ў Галоўную Выбарную Камісію сьпісак № 8 Украінскай сялянска-работніцкай партыі і № 10 партыі Chłopskiej.

№ 9, як абаротная 6, не будзе фігураваць у сьпісках, каб ня зьмешываць яго з шасьцёркаю.

17 студзеня пададзены сьпісак № 11 польскіх манархістаў.

БЛЕК ТРАШЧЫЦЬ ПА УСІМ ШВАМ.

З блёкам нац. меншасьцяў пана Грынбаўма зусім дрэнна. З жыдоўскага грамадзянства ў ім прыймае удзел зусім нікляя частка. Некалькі больш моцных жыдоўскіх арганізацыяў выступілі з самадзельнымі сьпіскамі, а рэшта прыступіла да стварэньня агульна-нарадовага блёку, які нядаўна выпусьціў, адозву зьмешчаную ў рожных жыдоўскіх газэтах, у якой заяўляе, што „нацыянальныя інтарэсы жыдоўскага народу патрабуюць стварэньня адзінага жыдоўскага блёку“. Адозва далей адцяняе, што пэўныя жыдоўскія групы, складаючыя нязначную частку жыдоўскага грамадзянства, кіруемыя эгаістычна-партыйнымі інтарэсамі, блёкуюцца з меншасьцямі іншых веравызнаньняў, якія маюць зусім іншыя інтарэсы, чым жыды. У канцы адозва жыдоўскага нац. блёку заклікае ўсе жыдоўскія арганізацыі да аб'яднаньня на падставе уласнай жыдоўска-нацыянальнай праграмы у Польшчы.

Вельмі цікава характэрызуе акцыю Грынбаума Нью-Іорская жыдоўская газэта „Моргэн Журналь“, якая піша, што „блёк нац. меншасьцяў стварыла жыдоўская палітычная партыя, стоячая на грунце пастулятаў Грынбаўма, якая зьяўляецца няшчасьцем для жыдоў!“

Дзеля гэтага зусім зразумела, чаму ахапіў жах тых немцаў і украінцаў, якія з пачатку згадзіліся на блёкаваньне з жыдамі, а цяпер, бачучы, што папалі ў прасак, няведаюць як выйсьці з гэтай прыкрай сытуацыі. У лёне украінскага Унда ўвесь час вядзецца дыскусія на тэму, ці патрэбны блёк у той форме, у якой ён існуе цяпер. У апошні час распаўсюджыліся неправераныя чуткі, што быццам немцы і украінцы зусім выйшлі з блёку, што азначае поўны развал Грынбаўмскага няўдалага твору? Калі толькі гэтыя чуткі спраўдзяцца, дык тады не ўратуюць яго і беларускія галасы, прададзеныя Ярэмічам, Рагуляю, Сабалеўскім і Багдановічам за свае мандаты, якія, можна быць ужо зусім пэўнымі, не ўбачаць новых мандатаў, як сваіх вушэй. Есьць такія рэчы, дзе нават і грошы (жыдоўскія) з прадацельствам не памогуць.

УНДО ПЯЦІЦЦА НАЗАД.

У мінуўшым тыдні распачалася конфэрэнцыя цэнтральнага камітэту украінскай партыі „Ундо“, на якой пасьля доўгай дыскусіі было ухвалена не ўваходзіць да блёку нац. меншасьцяў на тэрэні Усх. Галіцыі і выступіць з уласным сьпіскам. Аб гэтым быў паведамлены тэлеграфічна Грынбаўм. У хуткім часе пасьля гэтага цэнтральны камітэт Ундо атрымаў тэлеграму, падпісаную Грынбаўмам, Гасбахам і Ярэмічам, у якой апошнія прад'явілі Унду ультыматум, што калі Ундо ня згодзіцца на блёк нац. меншасьцяў у Усх. Галіцыі і не дасьць жыдам 5 мандатаў, дык у такім выпадку лідэры блёку выключаць украінцаў з блёку на тэрэні усей Польшчы. Аднак-жа, дзякуючы інтэрвэнцыі старшыні партыі Лявіцкага, папярэдняя ўхвала была затрымана і для асабістых гутарак былі запрошаны да Львова Грынбаўм, Гасбах і Ярэміч. Ці удасца гэтым „тром кітам“ блёку нац. меншасьцяў уратаваць безнадзейную сытуацыю блёку, невядома.

АДНЫЯ ЯДНАЮЦЦА, А ДРУГІЯ ГРЫЗУЦЦА.

Між Польскаю Сацыялістычнаю партыяй і Вызваленьнем зроблена ўмова, на падставе якой у некатарых выбарных будуць выстаўляцца агульныя сьпіскі. У тых мястах, дзе Вызваленьне чуе сябя слаба, аддасьць свае галасы за сьпісак P.P.S. і наадварот. Гэткім чынам належыць чакаць супольнага выступленьня вызваленцаў і пэпээсаў і на нашым тэрэні. Усе яднаюцца, толькі самі беларусы, поўныя гаспадары у сябе дома, замест запраўднага аб'яднаньня, падзяліліся на нескачальны лік рожных партыяў і групаў, якія толькі грызуцца і лаюцца між сабою, абліваючы адзін аднага памыямі. А хто з гэтага выкарыстае? Толькі не беларусы, разьбіваючыя свае галасы у уваемнай барацьбе замест нацыянальнай згоды і еднасьці...

ГАНДЛЮЮЦЬ ПАСОЛЬСКІМІ МАНДАТАМІ.

Паасобныя жыдоўскія арганізацыі, уваходзячыя у склад створанага Грынбаўмам блёку нац. меншасьцяў, пастанавілі браць ад кожнага жыдоўскага кандыдата, якога імя будзе зьмешчана на сьпіску да Сойму і Сэнату, па 3000 зл. Выбарны камітэт атрымаў шмат прапазык, згаджаючыхся нават на значна большыя сумы.

УКРАІНСКІЯ СЬПІСКІ.

З Варшавы паведамляюць, што ад блёку нац. меншасьцяў засталася адна фікцыя. Украінцы выстаўляюць тры вялікія асобныя сьпіскі: 1) Ундо, 2) Нацыянальны Украінскі Саюз (сьпісак № 6) і 3) камунізуючы „Сельроб“.

КСЯНДЗАМ ЗАБАРОНЕНА ВЫСТАУЛЯЦЬ КАНДЫДАТУРУ.

З Пазнані паведамляюць, што гэнэральны вікарыят атрымаў тэлеграму з Рыму ад прымаса кардынала Глонда, забаранаючага кс. Стыхелю, Прондзінскаму і Клінку выстаўляць кандыдату да Сойму і Сэнату. Першыя два у папярэднім Сойме належылі да Z.L.N., а Клінка да блёку нац. меншасьцяў ад немцаў.

24%, Англіі — 5,3%, Польшчы каля 35%, Юга-Славіі — 19%, Румыніі—14%, Чэха-Славакіі—17% і Нямеччыне—5%.

У той час, як у Нямеччыне афіцыяльна пад ружжом стаіць каля 0,2% усяго насельніцтва, ў рэшце дзяржаваў гэты процант хістаецца між 0,8% — 1,36% усяго насельніцтва (13 мільённая Чэха-Славакія мае на 20,000 большую армію, чым 65 мільённая Нямеччына). Адсюль гэткія карысьці і некарысьці ўзбраеньня: Нямеччына, маючая 100,000 армію і выдаючая толькі 5% свайго бюджэту на яе (хаця у агульнай лічбе гэтыя выдаткі значна большыя, чым увесь польскі дзяржаўны бюджэт), мае магчымасьць больш пасьвяціць увагі гаспадарчаму жыцьцю, чым, напрыклад, Польшча, трацячая 1/3 свайго бюджэта на армію. А гэта дае ей магчымасьць дасягаць перамогу на мірным гаспадарчым фронце. А з другога боку перавага ў вааружэньні дае гэтым дзяржавам палітычныя перавагі над разаружнымі дзяржавамі, ад якіх яны ня могуць адмовіцца. Вось гэты апошні факт і зьяўляецца галоўнаю перашкодаю на шляху агульнага разбраеньня. Хоць трашчаць ад ваеннага цяжару, але ня хочуць паменшыць сваіх арміяў. Гэткім чынам тая-ж Францыя, стогнучая пад цяжарам мілітарызму (1,23% насельніцтва пад ружжом і 18% бюджэту) і шукаючая шляхаў агульнага разбраеньня і забясьпячэньня міру, б'ецца лбом у сьценку, бо фактычна ніколі ня згодзіцца на паменшаньне сваей арміі, з чым зьвязана яе палітычная вага ў Эўропе. А хто ў канечным выніку выйграе, ці вааружонныя, ці разаружонныя дзяржавы, пакажа будучыня. Хаця ўжо агульна прызнана, што Нямеччына, прайграўшая вайну, выйграла мір.

N.

Здрада Мацея Пятровіча.

„Толькі подласьць людзкая бязмежна“... (з старых ісьцін).

Хто ня помніць той барацьбы, якую вялі нашыя нацыянальныя арганізацыі за першых беларускіх войтаў? У гэтай барацьбе можа найбольш яскравым момэнтам была барацьба за войта Палачанскай гміны М. Пятровіча.

М. Пятровіч, як ведама, пасьля першага паседжаньня быў звольнены з войтаўства, арыштаваны і пасаджаны ў турму. Нашы арганізацыі, а перад усім Старшыня Бел. Нац. Рады прыкладжылі усе высілкі, каб абараніць яго. За яго была зараз-жа зложана каўцыя. Арганізацыя паручылася за яго. Справа была пушчана надзвычайным ходам і... праз 2 дні Пятровіч быў на волі, праз 11 дзён справа яго спынена, яшчэ праз тыдзень ён зноў быў выбраны войтам і зацьверджаны уладай. І зноў падчас другога выбраньня войтам яму памагла Бел. Нац. Рада, прадстаўнікі якой (Старшыня п. Паўлюкевіча і п. Вернікоўскі) спэцыяльна прыяжджалі на выбары у Палачаны.

Барацьба была выйграна: беларускага войта мы абаранілі. Лічучы, што войт не павінен займацца палітыкай, мы звольнілі Пятровіча з абавязкаў нашага інструктара (адтрымаліваўшага сталую пэнсію) і больш ніякай палітычнай працы яму не даручалі. Адзіным момэнтам, калі Пятровіч зноў быў высунуты нашай арганізацыяй на першы плян — гэта быў 1-ы Зьезд Беларускіх Радных і Войтаў, *на якім нашая арганізацыя* высунула яго на старшыню. На зьезьдзе радных Пятровіч ані воднага разу у нас больш ня быў, ні палітычнай ні культурна-асьветнай працы ня вёў. У дню 6-га студзеня раптам прыехаў да нас, і быў цэлы дзень ад 10 раніцы да 4 папаўдні. Пытаўся аб нашай акцыі, як мы ідзём на выбары — ці ў блёку, ці адны, — *якія маем сродкі* і г. д. Прасіў, каб яго паставілі на сьпіску кандыдатаў у Сойм і уключылі у Цэнтральны Выбарны Камітэт і, каб далі у гэтым пасьведчаньне. Атрымаў 25 зл. (аб чым ёсьць паквітаваньне!), ветліва з усімі разьвітаўся і „паехаў“ дамоў.

А (ужо!) на заўтра увечары у бальшавіцкай „Думцы Працы“ аказалася ягоная „дэкларацыя“ аб тым, што ён „пракана ўся“, што мы „манархістыя“, што мы выхаваўцы Кавэрды і г. д.

Апошняе „праступленьне“,—што у нашай беларускай рэдакцыі працаваў і каля нас вырас хлопчык ідэйны антыбальшавік—тэрорыста, забіўшы бальшавіцкага гада — міма волі *выказала таемніцу* гэтай дэкларацыі, бяз сумліву выдаўшы *фактычных аўтараў* гэтай „дэкларацыі“. Аўтарамі гэтай „дэкларацыі ёсьць тая сама рука, якая перад гэтым двум асобам з нашых сяброў няўдала прапанавала куды большыя сумы, як тую, за якую была куплена подлая правакацыйная здрада Пятровіча (кажуць, што Пятровіч свае сумленьне беларускага войтаўства прадаў за 400 даляраў!)

Камуністы кінулі гэтыя грошы і закрычэлі голасна аб развале „Паўлюкевічаўшчыны“, бо іх моцна непакоіць тая сіла, якую набіраюць нашыя нацыянальныя *антыбальшавіцкія* арганізацыі. Пасьпех і нябывала хуткі рост нашых арганізацыяў як палітычных, так асабліва культурна-асьветных (123 аддзелы „Прасьветы“!) і самаўрадавых, пры поўным фактычным разгроме палітычнай Грамады і спыненьні ў далейшым росьце грамадаўскіх культурных арганізацыяў пагражае згубам усялякіх уплываў Грамады, (а значыць і усходня-камуністычнай арыентацыі!) на беларускія масы.

У момэнт самаразьвіцьця сілы Грамады мы друкавалі многа дзесяткаў заяваў аб выхадзе грамадаўцаў з Грамады і далучэньні да Бел. Нац. Рады. Гэта быў фактычны развал, бо гэтых людзей мы ня куплялі! Мы прайшлі маўчком міма вачавіднай здрады Грамадзе аднага з яе лідэраў пасла Сабалеўскага. Мы аб гэтым ня крычэлі, бо Грамада ляжала разьбітай і фактычна і псыхолёгічна! І калі „Думка Працы“ пасьля здрады Пятровіча крычыць аб „развале“, дык выключна дзеля таго, што чуе нашу сілу... Грамада купіла аднаго подлага пералёта, які як паршывая, блудзячая беларуская авечка, грашыў 4 гады ў *польскай партыі* „Вызваленьне“, потым кідаўся да Грамады, нарэшце сам прыйшоў да нас быў як блудны пакаяўшыся брат, прыняты, падняты із бруду, высунуты намі ня толькі ў нашых арганізацыях, але на ганаровае становішча беларускага войта.

Дык з усей цьвёрдасьцю мы скажам: Грамаду з гэткім набыткам ня віншуем! Бо здрадніку, пералёту і правакатару ўсюду адна цана!

Але мы добра разумеем, што, плацячы Пятровічу даляры, камуністыя ня вельмі клапаціліся аб ягонай асобе. Ім хадзіла выключна аб тое, каб здрадаю *Пятровіча ударыць нас.*

Прызнаемся, што ударылі... Але выключна маральна. Ясна, што нам вельмі прыкра, што мы прыюцілі гада на грудзёх, як вельмі болесна і тое, што той чалавек, якога мы прыюцілі і вазьвялічылі, гэтае вазвялічаньне выкарыстаў на тое, каб ім-жа нас ударыць...

Але дарэмныя надзеі, дарэмная перадчасныя радасьць камуністаў аб нашым развале.

Як сьвет стаіць, былі, ёсьць і будуць здраднікі і правакатары. А як народ рэагуе на агідную здраду Пятровіча, найлепей сьведчыць першы пратэст (мы пэўны, што будуць яшчэ!) прадстаўнікоў ня толькі нашых арганізацыяў на вёсцы, але звычайных беларускіх безпартыйных сялян.

Камунікат Бел. Нац. Партыі.

Прэзыдыум Бел. Нац. Партыі на сваім надзвычайным паседжаньні 9 студзеня г. г. у справе быўшага свайго сябры М. Пятровіча прыняў наступную пастанову:

М. Пятровіч быў прыняты ў Б. Н. Партыю пасьля ягонай асабістай пісьменнай просьбы аб прыняцьці яго і ягоных сябраў, як б. вызваленцаў. Гэтую просьбу ён паўтарыў на партыйным зьездзе Б. Н. П. пісанай дэкларацыяй — („Бел. Слова“ N 17). Ад партыі М. Пятровіч быў вызначаны інструктарам, за што адтрымліваў сталую пэнсію і на што пры канцэлярыі Партыі маюцца асабістыя паквітаваньні М. Пятровіча. Пры дапамозе Б. Н. Партыі і Рады ён быў выбраны на войта і зацьверджаны ўладамі.

Ад момэнту вызначэньня войтам з абавязкаў інструктара быў звольнены і дзеля гэтай прычыны Партыя перастала выплачываць пэнсію, хаця М. Пятровіч дамагаўся гэтага. Жаднай палітычнай работы з даручэньня Б. Н. П. ня вёў. Заяву М. Пятровіча аб выхадзе з Б. Н. П. з адначасовымі высілкамі абвінаваціць арганізацыю, якая яго, згодна ягонай асабістай просьбай, прыняла — лічыць правакацыяй і агіднай здрадай ня толькі Б. Н. П., але і тым ідэям, якія Б. Н. П. накрэсьліла на сваім штандары. Паступак М. Пятровіча лічыць ганебным і аб'явіць яго публічна ворагам і здраднікам Беларускага Народу!

Старшыня Б. Н. П.
А. Паўлюкевіч.
Віцэ-старшыня
Я. Ярош.
Сэкрэтары
Я. Шыбка.
Х. Шыбут.
Сябры Прэзыдыума:
Г. Конопацкі.
М. Станкевічанка.

Пратэст.

Пратакол паседжаньня прадстаўнікоў беларускіх культурна-асьвятовых, самаўрадавых і палітычных арганізацыяў і безпартыйных сялян Вялейскага і Маладэчанскага павету 14 студзеня 1928 г. у м. Вялейцы.

Выслухаўшы даклад Старшыні Бел. Нац. Рады А. Паўлюкевіча ў справе выбараў да Сойму і Сэнату і аб здрадніцкім паступку М. Пятровіча, пастанавілі: кірунак Цэнтральнага Агульна-Беларускага Народнага Выбарнага К-ту, на сьпісках якога народ сам будзе выстаўляць сваіх кандыдатаў, прызнаць правідловым і поўнасьцю яго падтрымліваць, а паступок Мацея Пятровіча лічыць правакацыйным і ганебным, дзеля чаго лічыць яго, Пятровіча, здраднікам Беларускага Народу. (Сьледуе 30 подпісаў).

Пісьмо у Рэдакцыю.

У № 3 „Беларускага Дня“ вялікімі літэрамі былі надрукаваны два артыкулы: адзін аб „развале групы Паўлюкевіча“, а другі пад загалоўкам „арышт б. віцэ-старшыні Бел. Нац. Рады М. Пятровіча“.

Першы артыкул „даказвае“ аб „развале Паўлюкевічаўшчыны“ гэта значыць усіх тых культурных, палітычных і самаўрадавых арганізацыяў, якія гуртуюцца каля Беларускай Нац. Рады, як органа пазапарлямэнтарнага прадстаўніцтва Беларускага Народу выбранага на зьезьдзе Заходняй Беларусі.

Па першае ў артыкуле гэтым ёсьць мана, бо Пятровіч ніколі віцэ-старшынёю Бел. Нац. Рады ня быў, а належыў толькі да Партыі. Затым з 12 сябраў прэзыдыума партыі выступіў толькі адзін здраднік Пятровіч, і апрача гэтага адзінага здрадніка ніхто з партыі больш ня выступіў, а наадварот—усе клеймяць прадажніка Пятровіча!

Што-ж датычыць другога артыкулу—аб арышце Пятровіча, — у якім рэдакцыя „Бел. Дня“ просіць „разсеяць“ нейкі туман наўкола гэтае справы, і амаль ня бавінавачвае мяне ў гэтым арышце, дык лепшым адказам на гэта будзе тое, што М. Пятровіч зусім ня быў і не ёсьць арыштаваны і нават да гэтай пары займае становішча войта Палачанскае гміны!!!

А. Паўлюкевіч.

АБВЕСТКА.

Гэтым Цэнтральны Агульна-Беларускі Народны Выбарны Камітэт падае да ведама, што уневажняе паўнамоцтва свайго інструктара Гальяша Бурага на Ракоўскую гміну з прычыны нарушэньня ім дысцыпліны і пасьведчаньне, выданае яму, лічыць няважным.

Адначасова завешываюцца пасьведчаньні, выданыя праз яго, якія павінны атрымаць новыя пацьверджаньні ад Цэнтральнага Камітэту.

Раяшнік.

(Аб Міткевічу Аўгэнію — нашаму спрытнаму гэнію, аб Плаўсюку, Пятровічу і аб кабетах і аб пасольскіх дыетах!)

Вось Аўгэні Міткевіч, братулак, за тое, што ўспомнілі мы пра „прытулак“, пра ягоныя даўнейшыя чыны, за гэтыя вось успаміны, вось дык на нас „абазьліўся“, што сьмярдзючаю пенай заліўся...

А мае вы браточкі!...

Панясло як із бочкі з ягонага „Выбуха“ — гэтак званага і быццам праз Плаўсюка выданага...

А хто-жа ёсьць Плаўсюк наш панок?!

Ці ня той, што абакраў наш гурток?!

І пад ціхія тары-ды-бары, што ў жыда пакраў самавары?!..

І справа аб кім ужо ў „toku“ і з тога і іншага боку?!...

Вось дык яны — гэныя кумпаны?!

А Міткевіч, мой брацік! Ой сьмяецца, рагоча „мандацік“—бо „стаўка“ твая ужо ёсьць біта і ў разьбітага зноў будзеш карыта.

Хай жа Плаўсюк ужо цябе „васьпявае“ і славу тваю васхваляе!...

Amen!...

А ў новым жыцьці сваім ціхам — не памінай нас, паночак, ты ліхам!...

—··—

А на пасольскія вось ужо „дыеты“, разрухаліся нават кабеты, і нашыя дэвоткі павы пушчалі „ulotki“ і кандыдатаў сваіх выстаўляюць — да „Аб'яднаньня“ усіх заклікаюць...

Вось гэта і нова і зусім правідлова, бо калі нашыя павадыры (чорт іх усіх падзяры!) ня могуць зрабіць ужо гэта — хай зробіць тады ужо кабета... на сорам усім нам.

І ў Сойме засядзе ужо не Адам, ня дзяцька з павета, а Эва — з вёскі кабета...

І пэўненькі будзьце — мы вось вітаем і дзе трэба ужо падтрымаем...

—··—

А вось вам Пятровіч — усімі ужо знаны і праз нас-жа разрэклямаваны. Хто ведае яго ужо даўно — выбачайце?! — той скажа, што гэта... драньнё але... за добрую „ўзятку“ — родную прадасьць і матку, а ня толькі ужо нас?! Ого?! Не ананас і не з капусты качан — гэты войт з Палачан?!... Хай-жа яму ужо ікнецца, як пра нас успамінецца!! ..

Шэйнэ-Катарынка.

Апошнія навіны.

З Польшчы.

ПОЛЬСКАЯ НОТА ЛІТВЕ.

12 студзеня выехаў з Варшавы праз Рыгу да Коўны адзін з вышэйшых урадоўцаў мін. загр. справаў, які вязе з сабою ноту польскага ўраду у справе распачацьця супольных перагавораў на падставе пастановы Рады Лігі Народаў. Польшча прапануе мейсцам перагавораў Рыгу. У ноце ўказваюцца пункты, якія увойдуць на дзенную павестку, як урэгуляваньне гранічнага руху, жал.-дарожнай і паштовай камунікацыі, справы транзыту і г. д.

ЗЬЕЗД ВАЯВОДАЎ.

10 студзеня адбылося паседжаньне ваяводаў, скліканых міністрам унутраных справаў з усяе дзяржавы. У паседжаньні прынялі удзел віцэ-прэм'ер Бартэль, мін. унутраных справаў Складкоўскі, статс сэкрэтар мін. ун. справаў Ярошынскі і дырэктар палітычнага дэпартамэнту Сьвітальскі. Пасьля прамовы віцэ-прэм'ера Бартэля і рэфэрату дырэктара палітычнага дэпартамэнту Сьвітальскага адбылася дыскусія пад кіраўніцтвам мін. Складкоўскага, у часе якой абгаварываўся рад пытаньняў, зьвязаных з выбарамі да Сойму і Сэнату:

АРЫШТЫ КАМУНІСТАЎ у ПІНШЧЫНЕ.

Паліцыйныя ўлады прыступілі 6 студзеня да ліквідацыі камуністычнай арганізацыі на тэрэне Піншчыны. Арыштованы шэраг камуністычных дзеячоў, у якіх знойдзены рэчавыя доказы антыдзяржаўнай дзейяльнасьці.

З заграніцы.

АДМЕНА РАДАВАЙ ЭКСТЭРЫТАР'ЯЛЬНАСЬЦІ Ў ГРЭЦЫІ.

Грэцкі ўрад пастанавіў пазбавіць усіх сябраў савецкага торгпрэдства правоў экстэрытар'яльнасьці (нятыкальнасьці) за выключэньнем яго старшыні, каб гэткім спосабам не дапусьціць камуністычнай прапаганды. Іншым дзяржавмм належыла-бы узяць прыклад з Грэцыі.

„АРКОС“ Ў АМЭРЫЦЫ.

Савецкі ўрад рашыў арганізаваць у Аргэнціне гандлёвае прадстаўніцтва па прыкладу Аркоса у Лёндане. Прадстаўніцтва гэта будзе называцца „Южамторгам“, з капіталам 186,000 ф. штэрлінгаў. Аргэнтынскі ўрад быццам ужо даў сваю згоду на гэты новы прытон бальшавіцкае камуністычнае шпіёнскае агітацыі.

АРЫШТ КАПІТАЛУ ПАРЫЖСКАГА ПОЛПРЭДСТА.

Гандлёвы суд Сенскага дэпартамэнту у Францыі на падставе стараньня 30 парыжскіх банкаў пастанавіў налажыць арышт на 20 міл. франкаў, належачых савецкаму торгпрэдству у Парыжы і знаходзячыхся на бягучым рахунку.

ЯК АМЭРЫКА РАЗБРАЯЕЦЦА.

Марскі міністар заграгічных штатаў, даручыў марской камісіі кангрэсу праэкт будовы 25 крэйсараў па 10,000 тонаў, 32 падводных лодак, 9 контрмінаносцаў і 5 плаваючых лётнічых портаў.

СЬЛЯДЫ КАМУНІСТЫЧНАИ УЛАДЫ.

З Шанхаю паведамляюць, што ахвяраю тэрорыстычных камуністычных урадаў у правінцыях Квайтунг, Гайфунг і Луфунг пала 10,000 асоб. Камуністыя трымалі ўладу ў гэтых вакругах 2 месяцы. Мардавалася па некалькі сотняў чалавек у адным мейсцы. Вымардаваны усе заможныя асобы і інтэлігэнтныя, не спрыяючая камуністам. Зьнішчаны ўсе сьляды прыватнае уласнасьці.

НОВЫ КАБІНЭТ ЛАТВІІ.

У Латвіі стварыўся пасьля 3-х тыднёвага крызысу новы кабінет, не сацыялістычны, пад кіраўніцтвам пасла з дэмакратычнага цэнтру Юрашэўскага. У склад новага кабінету уваходзяць 4 сябры правіцы, сярод адзін немец Магнус, два цэнтраўцы, адзін летгаліяц і 3 безпартыйных. Міністар заграгічных справаў ня вызначаны да гэтай пары і на гэта становішча вызначаецца цяперашні пасол ў Коўне Балодіз.

ЗЬЕЗД ЛІТВІНОЎ у МЕНСКУ.

8 студзеня ў Менску у салі акружнога выканаўчага камітэту адкрыўся першы зьезд літоўскіх дэлегатаў. Якую вялікую вагу прыдае радавы ўрад гэтаму зьезду відаць з таго факту, што ў зьездзе прыняў удзел цэнтральны выканаўчы к-т Радавае Беларусі. Прывітальную прамову прачытаў сэкрэтар выканаўчага камітэту камуністычнае беларускае партыі Васілевіч.

ТРАГЭДЫЯ НА ПАДВОДНАЙ ЛОДЦЫ S. 4.

Уся Амэрыка знаходзіцца пад уражаньнем страшнай катастрофы, здарыўшайся ў глыбіні акіяна унутры амэрыканскай падводнай лодкі „S. 4,“ якая з нявыясьненай прычыны затанула. Працы па ратаваньню маракоў, лікам 20 чалавек, вядуцца вельмі энэргічна, але ніякіх надзеяў няма на уратаваньне іх жыцьця. Спробы даставіць унутр лодкі кісларод і яду аказаліся нявудачнымі. Знакамі Морза няшчасныя паведамілі: „мы адчынілі апошнюю бляшанку з паветрам. Дайце нам паветра!“ Затым зноў: „працуйце хутчэй! Задыхаемся“. Уся Амэрыка малілася аб іх ратунку. Праца вялася энэргічна. Але уратаваць няшчасных ня ўдалося.

У ЧЫРВОНЫМ ПЕКЛЕ.

АПАЗЫЦЫЯНЭРАЎ ВЫСЫЛАЮЦЬ У СЫБІР.

Паводле бэрлінскіх газэт радавы ўрад пастанавіў высылаць апазыцыянэраў у Сібір. 30 чалавек, сярод якіх знаходзіцца і забойца царскай сям'і Белабародаў, атрымалі ужо загад аб выезьдзе. Троцкі, Зіноўеў і Каменеў пакуль астаўлены ў спакоі.

„Uniteld Press“ падае наступныя дадатковыя драбязгі высылкі апазыцыянэраў у ссылку: апрача Троцкага выслана будзе не 29, а 51 праціўнік Сталіна. Між імі аднак не знаходзяцца пакуль ні Каменяў, ні Зіноўеў. Высылаюцца на 3 гады у мейсцы аддалёныя на некалькі сот кілямэтраў ад станцыяў і местаў і будуць атрымліваць па 9 руб. у месяц. Частка высланых ужо знаходзіцца ў дарозе. Троцкага хацелі выслаць у Астрахань, але ён адмовіўся выехаць дабравольна. Бышы пасол у Парыжу Ракоўскі будзе высланы ў Сысольск на беразе Белага мора, лідэр апазыцыі Смігла, які ужо 6 мес. знаходзіцца ў Хабараўску, там застанецца і надалей. Сафронаў будзе высланы на воз. Онега, Сярэбракоў да Семіпалатынску у Туркестане. Рэдактар „Праўды“ Сосноўскі—у Сыбір.

Вось цяпер таварышы камісары спрабуюць, якая ссылка лепш, царская ці пралетарская!

Распаусюджывайце сваю газэту

Самаварны „Рэдактар“

У Баранавічах выйшаў лісток „Выбух“, дзе напісана гэтулькі чапухі, што рэагаваць на гэтую гадасьць мы ня думаем і ня будзем, бо ці-ж можна рэагаваць на напады п'янага вар'ята ці шаленага сабакі?...

Але ў справе шулерства, дапушчанага у „Выбуху“, мы зарэагуем, перадусім зразумела ў пракурора. А пакуль „рэдактара“ і выдаўца „Выбуху“ Васіля Плаўсюка пацягнуць да судовай адказнасьці, лічым патрэбным падаць усяму беларускаму грамадзянству аб гэтым новым безабразным факце, дапушчаным Міткевічам праз падстаўную асобу — Плаўсюка. У „Выбуху“ падана наступнае пасьведчаньне: „Беларуская Рада.

Tymczasowa Rada Białoruska.

Пасьведчаньне.“

Гэта ёсьць самае грубае *шулерства*, бо штампу гэтага ніколі ў Час. Бел. Радзе ня было. Штамп Час. Бел. Рады быў гэткі: „Tymczasowa RadaBiałoruska“. Часовая Беларуская Рада“.

Як відаць, фальш вачавідны, бо 1) па польску на правідловым блянку, як на мове дзяржаўнай, напісана раней, а потым па беларуску, 2) напісана ў сфальшаваным пасьведчаньні не *Часовая* Белар. Рада, а проста Беларуская Рада — гэта другі фальш, 3) ніколі, нідзе і ніхто непадпісвае на пасьведчаньнях *імя* і прозьвішча, гэтага толькі ня ведае „рэдактар“ Плаўсюк 4) на кожным пасьведчаньні заўсёды павінен быць *подпіс сэкрэтара*, якую шулеры *забыліся* паставіць, 5) прозьвішчаў непадана — бо іх німа.

Нарэшце, каб цалком ацаніць вартасьць гэтага „Выбуху“ наагул, а асабліва тых пахвальбаў, якія „Выбух“ скіроўвае па адрэсу фактычнага выдаўцы яго—Аўгэна Міткевіча, даволі будзе сказаць, што „*рэдактар*“ і выдавец гэтага „Выбуху“, які гэтак „*чэсна*“ і „*сьмела*“ бароніць Аўгэна Міткевіча, гэта ніхто іншы як патэнтаваны крыміналіста, які судзіўся за кражу самавара, а цяпер мае новую крымінальную справу: пакраў кніжкі і рэчы гуртка „Прасьветы“ ў Баранавічах, з якога год назад быў выкінуты.

Вось дык „рэдактар“!

АРЫШТЫ Ў МЕНСКУ.

У апошнія дні у Менску арыштавана 50 чалавек, абвінавачаных у „контр-рэвалюцыі і шпіянажы“. Сярод арыштаваных знаходзіцца некалькі палякаў.

ЗУСІМ ЗВАР'ЯВАЛІ.

Польскае Тэлегр. Агэнства і Агэнства Гавас паведамляюць, што Ватыкан быццам атрымаў з Масквы нотыфікацыю асуду, асуджаючаго Папу на сьмерць за падтрыманьне антыбальшавіцкага руху шляхам удзяленьня фінансавай запамогі. Хаця трудна паверыць гэтым чуткам, але ад крэмлеўскай банды усяго можна чакаць.

АХВЯРЫ Г. П. У. (Чэка).

Уся чырвоная Саўдэпія урачыста сьвяткавала нядаўна 10 угодкі існаваньня усерасейскай чрэзвычайкі, заснаванай Леніным і Троцкім. Па дакладным даным інфармацыяў, якія пасядае англійскі урад, лік крывавых ахвяраў Г. П. У. да гэтай пары пераваліў за 3,000,000 чалавек.

УСЯЧЫНА.

ПЯЦЬ СУТАК У ШКЛЯНОЙ ТРУНЕ.

Індускі факір Тока Мары прадэманстраваў ў Штутгардзе (Нямеччына) надзвычай цікавы вопыт. А ласьне яго палажылі ў шкяную труну, унутраннасьць якой была зьвязана электрычным званком з канцэлярыяй спартовага клюбу, дзе дзень і ноч дзяжурылі сябры клюбу, і закапалі ў зямлю. Труна праляжала у зямлі 120 гадзін і 7 сьнежня раздаўся званок, сьведчачый, што факір праснуўся. У прысутнасьці 7,000 зацікаўленых была выкапана з зямлі труна і камісія лекарская і спартовая сьцьвердзіла, што пячаці і века труны некрануты. Факір выйшаў, хістаючыся, з труны, выняў з шыі, вушэй і пальцаў доўгія іголкі, якімі папракалываў сябе 120 гадзін назад і папрасіў вады і шклянку шакаляду. Дахтары сьцьвярдзілі, што пульс б'ецца вельмі слаба і што ён страціў у часе 120 гадзін сну 12 кілямаў вагі.

НАЙВЯЛІКШЫЯ ГАРАДЫ НА СЬВЕЦЕ.

Перад вайною лік гарадоў з мільённым насяленьнем не перавышаў 20, а ласьне у Эўропе было 10, Амэрыцы 5 і Азіі — 5. Цяпер Эўропа мае гэткіх гарадоў 15, Амэрыка — 18, Азія — 11 і Аўстралія — 1. Найвялікшым горадам зьяўляецца Нью Іорк, маючы 9 мільёнаў 350 тысяч жыхароў. (Большы чым наступныя дзяржавы: Бэльгія, Голяндыя, Аўстрыя, Партугалія, Ірляндыя, Баўгарыя, Швэйцарыя, Фінляндыя, Грэцыя, Нарвэгія, — Літва і г. д.). Затым ідзе Лёндан— 7 міл. 660 т. жыхараў, Парыж — 4 м. 600 т. ж., Бэрлін — 4 м. 125 т. У Азіі — Осака — 2 м. 115 т. і Аўстраліі — Сідней — 1 міл. 50 тыс. жыхараў. У Польшчы толькі Варшава мае 1 м. 15 т. жыхараў.

Да працы!

I

Праца вялікая сіла,
Праца нам шчасьце дае,
Праца ўвесь сьвет ускарміла,
Ўсё ў ім прадукты яе!

Працаю сілы прыроды
Розум зрабіў парабкамі:
Суша, паветра і воды,
Служаць яму ўжо вякамі.

Праца ўпартая ў думках
Цемру вякоў зваявала
І для людзей ў навуках
Сонца ясьней зазіяла.

І сьветла зрабілась нам у жыцьці,
Мы бачым, што ўсе мы — раўня,
Што трэба змагацца і выйці
І нам з сярэднявечнага дня.

Мы бачым свой край у прыгоне,
У цемры, ў нудзе, беднаце,
Ў каждай хаце яго й на загоне
Гора красуе, цьвіце...

II

Дык разам Сябры-жа да працы
Злучайцеся як наймацней,
Каб зьнішчыць нам цемры палацы,
Каб сонца Край ўбачыў хутчэй:

Каб у Ім ня было Вацькі і Маткі
Няўмекаўкаў чытаць і пісаць,
Зямлянкі ці курнае хаткі,
Ні „пуху“ ў хлеб дацаваць.

Каб Брацьця за сініе мора
Ня пёрлісь па хлеб, як па шчасьце,
Пакінуўшы ў нэндзы і горы
Сямью на ласкавасьць няшчасьця.

Каб дзеці ня йшлі па навукі
Да розных суседніх краёў —
Каб сэрца ня рвалась ад мукі
Адцурваньня лепшых сыноў,

Адцурваньня того, што маем
Самым дарожэйшым у сябе
На'т што ад веку трымаем—
Прошласьці, мовы свае!

Казімірко Уладз.

АЭРАСТАТ R. 100.

У красавіку гэтага года будзе закончана будова у Англіі аэрастата R 100, заказанага міністэрствам авіяцыі на авіяцыоных майстроўнях у Гоўдэне. Пасьля некалькіх пробных лётаў аэрастат паляціць з Англіі да Амэрыкі праз Антлянтычны акіян; узяўшы з сабою паштовы багаж, 100 пасажыраў і 500 чалавек абслугі. Гэта паветраная паездка будзе каштаваць па 120 фунтаў штэрлінгаў ад асобы.

Самы стары чалавек на сьвеце.

Самы стары чалавек на сьвеце аб якім маюцца дакладныя весткі — нарвежац. Яму ужо мінула 149 гадоў. Ен першы раз жаніўся 111 гадоў назад. Потым, аўдавеўшы, хацеў зноў жаніцца, калі яму было 132 г. Але яго аб'ект каханьня спужалася яго праклоннага ўзросту і ў апошнюю хвілю адмовілася выйсьці за яго замуж.

У турме Фольсоме (Зл. Штаты) узбунтавалася 1000 арыштантаў, якія зрабілі спробу пабегу. Пры гэтым 2 стражнікі і 5 арыштантаў забіты і 17 арыштантаў, афіцэр паліцыі і сэкрэтар турмы ранены. Бунт ліквідаваны пры дапамозе 500 салдатаў і паліцыі узброеных пулямётамі.

ЛІК ВЫБАРШЧЫКАЎ ДА СОЙМУ Ў ВІЛЕНСКІМ ВАЯВОДЗТВЕ.

Лік маючых права галасаваньня да Сойму на тэрэне Віленскага ваяводзтва складае 489,000 выбаршчыкаў, якія дзеляцца на пасобныя паветы ў наступным парадку:

Вільня — 104,000, Віленска-Троцкі павет — 93,000, Ашмянскі — 47,000, Браслаўскі — 65.000, Дзісьненскі — 68,000 Пастаўскі — 49,000, Сьвенцянскі — 66,000 Вялейскі — 57,000, Маладэчанскі — 40,000.

Тэрэн Віленскага ваяводзтва будзе надзеляны на 3 выбарныя вокругі—63, 64 і 65. Выбарны вокруг № 63, у склад якога уваходзіць м. Вільня і Віленска-Троцкі павет, мае ўпраўненых да галасаваньня 197,000 асоб. На гэты вокруг прыходзіцца 5 мандатаў.

Выбарны Вокруг № 64 з цэнтрам у Сьвенцянах, у склад якога уваходзяць паветы Сьвенцянскі, Ашмянскі, Браслаўскі і Пастаўскі, мае 227,000 галасоў.

Рэшта галасоў прыходзіцца на Выбарны Вокруг № 65, у склад якога уваходзяць паветы Дзісьненскі, Вялейскі і Маладэчанскі. На гэты вокруг прыходзіцца 7 мандатаў.

ЧАРГА НА СЬПІСКАХ БЛЕКУ НАЦ. МЕНШАСЬЦЯЎ.

13 студзеня ў Варшаве была установлена чарга кандыдатаў на сьпіску блёку нац. меншасьцяў, а ласьне: 1) украінец, 2) беларус, 3) жыд, 4) немец і 5) літвін.

Тутэйшая хроніка.

— ВЫЕЗД п. ВАЯВОДЫ ДА ВАРШАВЫ. Пан Ваявода Рачкевіч 9 студзеня выехаў на некалькі дзён да Варшавы па службовым справам. У часе свайго прабываньня ў Варшаве п. Ваявода прымаў удзел у зьезьдзе ваяводаў.

— ЗЬЕЗД СТАРАСТАУ. 18 студзеня ў гмаху Віленскага ваяводзтва адбыўся зьезд Старастаў Віленскага ваяводзтва пад кіраўніцтвам Ваяводы п. Рачкевіча. Разглядаліся пытаньні адміністрацыйнага характару, адбудовы Краю і будучых выбараў да Сойму.

— ЗАПЯРЭЧАНЬНЕ. У „Беларускім Дню" (N 3) надрукавана, што М. Пятровіч быццам састаяў віцэ-старшынёю Беларускае Нац. Рады. Гэта не адпавядае праўдзе, бо М. Пятровіч ніколі не належыў да Бел. Нац. Рады, а толькі да Бел. Нац. Партыі.

— ПАЛЕГКІ Ў УПЛАЦЕ ГРУНТОВАГА ПАДАТКУ. З мэтаю аблягчэньня выплаты залеглага грунтовага падатку сялянам тых рольных гаспадарак, якія ў 1925, 26 і 1927 г. пацярпелі ад стыхійных бедстваў, выразіўшыхся ў разьмеры 50% і ў зьвязку з гэтым адтрымалі спыненьне плацяжу грунтовага падатку да кастрычніка 1927 г. Міністэрства Скарбу прыслала да Скарбовай Ізбы пісьмо, ў якім уважняе Старшыню Ізбы Скарбовай спыняць уплату гэтых падаткаў па асабістым просьбам плацельшчыкаў да 1 кастрычніка 1928 г. пры варунку, што той час будзе заплачана васеньняя рата гэтага году.

— ЯШЧЭ АБ „ПРАКАНАУШЫМСЯ„ У гасьцінным „Бел. Дню" той самы Казюкевіч, які 1-ым з 100 радных аказаўся лоўкачом, браўшы грошы ад нас і Грамады, тлумачыцца, што ён адразу на зьездзе „праканаўся" у здрадзе п. Паўлюкевіча і г. д. і г. д, На гэтае мы адкажам толькі адным: Казюкевіча, як і іншых ніхто не змушаў фатаграфавацца побач з здраднікамі, аднак-жа яго фізыномія даволі ясна паскудзіць агульную фатаграграфію радных зьезду.

Дык ці-ж не ясна, што „пракананьне" наступіла пасьля дадатковай платы.

— ПАПЯРОВЫЯ 2 ЗЛАТОУКІ. У віду таго, што часта не прыймаюцца ў крамах папяровыя 2 зл. Віленская Скарбовая Ізба паведамляе, што гэтыя банкноты будуць у руху яшчэ да 31 чэрвеня бягучага году.

— ЭКЗАМЕНЫ ЭКСТЭРНАУ НА МАТУРУ Ў ВІЛЬНІ. Кураторыум Віленскага Школьнага Вокруга падае да ведама, што экзамены на матуру для экстэрнаў вясною 1928 г. адбудуцца ў лютым і сакавіку. Пачатак экзаменаў у панядзелак 20 лютага.

Просьбы з патрэбнымі дакумэнтамі прымае сэкрэтар'ят Кураторыума (Wilno, ul. Wolana 10) у службовыя гадзіны да 10 лютага 1928 г. Просьбы, прысланыя пасьля гэтага тэрміну ці не маючыя ўсіх патрэбных дакумантаў, узгледняны ня будуць. Да экзамену будуць дапушчаны толькі асобы, пражываючыя на тэрэні Віленскага Школьнага вокругу і адведываўшыя старшыя класы гімназіяў Віленскага вокруга.

У просьбе аб допуску да экзаменаў належыць указаць тып гімназіі (гуманістычная, прырода—матэматычная і клясычная), які экстэрн сабе выбірае і адцяміць, якую з новых моваў выбірае (французкую, англійскую ці нямецкую).

Да просьбы належыць далучыць!

1) Мэтрыку урадзінаў;

2) Уласнаручна напісаны жыцьцёрыс з вызначэньнем, дзе кшталціўся, калі і якія трымаў экзамены, як прыгатаўляўся да экзаменаў.

3) Школьнае пасьведчаньне, калі мае;

4) Вызначэньне тэмаў з польскай і інастраннай мовы.

5) Квіт Скарбовай Касы аб уплаце экзаменацыйнае таксы ў разьмеры 60 зл;

6) 2 ненаклеяныя фатаграфіі з уласнаручнымі подпісамі;

7) Пасьведчаньне аб моральнасьці, выданае адпаведнымі ўладамі на мейсцу пражываньня;

Сьпісак дапушчаных да экзаменаў будзе вывешаны ў пярэдняй кураторыуму за пяць дзён да 1 лютага і ўсялякія інфармацыі можна атрымаць у канцэлярыі Wydziału сярэдніх школаў у Кураторыуме.

— „ЧОРНАЯ" НЯУДЗЯЧНАСЬЦЬ... Ярэмічаўская „Сялянская Ніва" (№ 3) ў рубрыцы „Выбарная фільма", „разьбіўшы ўшчэнт" усе беларускія арганізацыі, апрача, зразумела, свайго Сялянскага Саюзу, накінулася нават на сваіх нядаўных саюзьнікаў—расейцаў. У зацемцы пад загалоўкам „Русскій Сумбур" піша: „ у выбарах 1922 г. Расейцы ўваходзілі ў агульны блёк нац. меншасьцяў. Цяпер іх да блёку ня прынялі за тое, як пісаў адзін селянін, што яны не прызнаюць Беларусі. У такім выпадку Расейцы выступілі асобна і пачалі разводзіць дэмагогію. Але-ж адразу загалёпаваліся"!...

І дальш Сель-Ніва пачынае нападаць на расейцаў за „дэмагогію", якая мала каго цікавіць з беларускага грамадзянства. Ужо „чыя-бы карова мычала, а твая (пане Ярома) маўчала"!!! Ці-ж ня чорная няўдзячнасьць ні за што, ні пра што нападаць на сваіх быўшых саюзьнікаў пры выбарах да віленскай і гарадзенскай мястовых радаў! Небось тады „господа" расейцы былі прыемныя і іх „дэмагогія" не перашкаджала „ісьці з імі агульным фронтам", пакуль не праваліліся. А цяпер, зьнюхаўшыся з жыдамі, ўжо задралі нос!

Адразу відаць манцэрскае выхаваньне і лёкайская псыхіка!

— ДА АРЫШТУ КОУША і ШНАРКЕВІЧА. Як ужо падавалася ў папярэднім нумары 6 студзеня былі арыштаваны быўшыя грамадаўцы Шнаркевіч і сьвяшчэньнік Коўш Арышт наступіў у зьвязку з тым, што месяц таму назад яны былі зволенены з турмы на Лукішках пад варункам, што да суда ня будуць займацца ніякай палітычнай працаю. Між тым арыштаваныя гэтага забавязаньня не стрымалі, бо Коўш стварыў разам з перашоўшым з уніяцтва архімандрытам Марозавым асобны выбарны сьпісак праваслаўных сьвяшчэньнікаў і распачаў палітычную акцыю. Распачалі выдаваць нават свой друкаваны орган у расейскай мове.

—ПЕРАВЯЗЕНЬНЕ ГРАМАДАЎЦАУ З ВРОНАК ДА ВІЛЬНІ. 11 студзеня прыбыў да Вільні з Вронак транспорт арыштаваных у справе Грамады, складаючыся з 6 асобаў, а ласьне: Б. Тарашкевіча С. Рак-Міхайлоўскага, П. Валошына, П. Мятлы, М. Бурсэвіча і Ф. Окіньчыца. Арыштаваныя былі прывезены да Вільні ў спэцыяльным вагоне пад моцнаю ахранаю, а з вакзала да турмы ў аўтамабілю, ахраняемым коннаю паліцыяй.

— АД ЦЭНТР. РАДЫ Т-ВА „ПРАСЬВЕТЫ" Некатарыя гурткі т-ва „Прасьветы" паведамляюць, што ў апошні час сярод іх некатарым сябрам робяцца прапазыкі выступіць з „Прасьветы", і аб гэтым абавязкова надаць у газэце. Між іншым на такую вудачку пана ўся і сябра гуртка „Прасьветы" у в. Морач Нясьвіжскага павету Рыгор Рудко. Хаця мы і зьмяшчаем у гэтым нумары адну з яго карэспандэнцыяў „Да Прасьветы!", аднак Цэнтральная Рада т-ва „Прасьветы" пастанавіла разьвязаць гэты гурток, адначасова даводзячы аб гэтым да ведама і перасьцярагаючы сваіх сябраў.

Цэнтральная Рада Т-ва „Прасьветы"

— ЦІ-Ж НЕ НАХАЛ... Адзін з кумпаніі Міткевіча і Цяулоўскага ў Баранавічах, Янка Шулейко выпусьціў лятучку, у якой заяўляе, што ён, як старшыня аддзелу „Прасьветы", выходзіць з складу сябраў баранавіцкага аддзелу. Яшчэ $1^1/_2$ месяца назад Я. Шулейко быў скінуты з становішча старшыні і выкінуты з ліку сябраў „Прасьветы" аднагалосна усімі сябрамі баранавіцкага аддзелу „Прасьветы" за грашавыя і не маральныя справы. А ён мае нахальства публічна заяўляць, што „сам выйшаў"

Ці-ж гэта не нахальства?!...

ЖЫЦЬЦЕ ПРОВІНЦЫІ.

ПЕРАСЬЦЯРОГА.

(*в. Шымкі Ваўкавыскага пав.*).

Быў у нашым мястэчку кірмаш. Ен што першага кожны раз. Неяк і я туды дастаўся. Грошаў ня было, за што выпіць, дык так сабе шляўся. Вядома, як чалавек не багаты, плюнуў на ўсё і хацеў ісьці да хаты... Ано бачу — народу, народу! У Мэндаля ля рогу загарадзілі мне на'т дарогу. Тут я няволяй спыніўся, дый, стаўшы, падзівіўся.

Стаіць сабе якісьці чалавек гладкі, рукамі махае, крычыць, нат бяз шапкі. Хоць я добра вушы растапырыў, але каб, ляпей пачуць, што ён там так дырыў, давай ціснуцца да ганка, здушыўшы якогось падпанка... Да „mówcy" дастаўся, слухаў, слухаў, дый дзіваваўся...

„Наша — кажа —„Stronnictwo Chłopskie", у якім Палякевіч усё вам дасьць, як з байкі каралевіч. Дабрабыт, зямлю, свабоду. Выведзем гэту паскудную моду, звончыкамі пры дузе званіць, платы ня будзем плаціць. Дарэчы кажа-тут сказаць, ці можна ў хлеве сьвіньню дзяржаць. Такія, кажа, завялі ў нас лады ўсе папярэднія ўрады. Якія у нас школы? Маюць, нявучаць дзяцей, а толькі з паперу выцінаюць. У нас павінна быць навука праўдзіва, просто такі на дзіва. „Rotę" мусіць кажды пяяці, гісторыю і геаграфію Польшчы знаці, ну і да рэчы яшчэ рахаваці. За намі, браткі, будуць меншыя падаткі. Цяпер, кажа, селянін, чуць пнецца—ад падаткаў ён гнецца".

Але прыкра стала мне яго мана. Хацеў я грызнуці такі таго пана. Але з боку стаялі з ружжамі франты, што завуцца у нас паліцыянты. Запытаю я іх праз сваю газэту, каб вядома было цэламу сьвету. Чаму вы, паночкі, пра наша гаротнае жыцьцё ано цяпер узналі? Сядзелі сабе на цёплых местах-крыўдзіць нас памагалі. А як Сойм ужо распусьцілі, з жалям да нас загутарылі. Запахлі вам мусіць мандаты, дык пакінулі свае сэкрэтарыяты, ды лётаеце па вёсках, як вароны каркаеце—„Сяляне, хочам вам абароны". Ды цяпер вы, пузачы ад лою, ўсталі за белоруса гарою.

Абы у Сойм пралезьці нашымі галасамі, тады яны разчытаюцца з намі! Тады нам напхаюць асаднікаў, а за імі „porządnych urzędników", па крэсавым справам спэцыялістаў, ну дый цывільных каляністаў. Абдзіраць нас, каб хадзілі босы і голы, замест беларускіх будуць польскія школы. Каб хутчэй Польшчу за „ojczyznę" мы лічылі і сваю нацыянальнасьць згубілі.

Гэй, сяляне, я вас заклікаю і гэтых ашуканцаў я добра знаю. Яны сябе назваю „хлопаў" прыкрылі, а ў хлопаў бульбу ў гародзі парылі. Зрабілі яны ў Вільні с падпанкамі „zjednoczenie", каб дзяліць беларускае „mienie" каб галавы нам дурманіць. Выбярэм іх у Сойм, будуць нас паганіць. Будуць апіваць нас, як вошы, а за мандаты сабе будуць лупіці грошы. Хай ні водзін голас ваш сялянскі не ўпадзе за той сьпісак chłopski! Праганяй іх прэч са сваей вёскі, хоць будуць ліць над нядоляй вашай кашачы слёзкі.

Ня слухайце „з'еднаньня"—гада, ў нас ёсьць Беларуска-Нацыянальная Рада, катора з намі знаецца, за долячку нашу змагаяцца. Хоць і дужа мае яна перашкод. Але як за ёю пойдзе увесь народ, усе разам даб'емся лепшай долі, чаго з другімі ня будзе ніколі. Будзем мець свае школы родны, ня будзем на палосках сядзець галодны. Ня будзем ласкі ад пана выглядаці і шапку прад імі здалёк яшчэ зьнімаці. Зможам аўтаноміі дабіцца і з намі будуць, як з народам, лічыцца. Будзем сваей долі кавалі мы самі, ня будуць паны называць нас хамы. А падпанкаў вы асьцярагайцеся і каля Нацыянальнай Беларускай Партыі яднайцеся!

Бо ёсьць і прыказка на ўсю тую гадасьць. Абяцанка—цацанка, а дурному радасьць.

3. I. 1928 г.

Шпілька.

Да „Прасьветы"!

(*в, Морачы, Нясьвіскага пав.*)

Як радасна чытаць у газэтах аб тым, што моладзь нашых вёсак будзіцца ад вякавога сну, прабіваючы сабе шлях да асьветы, культурнае працы і наагул да лепшага жыцьця. Творацца гурткі Т-ва „Прасьвета", адчыняюцца бібліатэкі-чытальні, ладзяцца спэктаклі і г. д. Сэрца радуецца за гэткаю моладзь—лепшых сыноў — грамадзян нашае Бацькаўшчыны.

Гэткая моладзь ня будзе забыта Ею ніколі і яе сьвятая, культурна-асьветная праца сьвяціць будзе вякамі, як сонца. Яна прагоніць з нашае гаротнае вёскі ўсю тую цемру і несьвядомасьць, усю бядоту, гора і пьянства, якія векамі тут панавалі. Чэсьць і падзяку Бацькаўшчыны запіша Вам гісторыя.

Але тым больш сумна, тым больш жудасна паглядзець на жыцьцё моладзі і наагул усіх сялян у маёй роднай вёсцы Морачы, Заостравецкай гміны. Вышэйшай мэтай гэтай моладзі — адзецца з „пыкам", а калі яшчэ асталося і на „кварту",—тады яму на бок усё,—багатыр ідзе— шапкі далоў! Было-бы сьмешна, каб ня надта сумна! Прыйдзе нядзеля, сьвята, зараз—гульбішча, вечарына. Але, каб вы ведалі, як яны адбываюцца! Кожны хлапец, к сораму сказаць нават і дзяўчаты, напьюцца гарэлкі, а потым пачынаюцца сваркі, бойкі. Паразьбіваюць сабе лабы, парэжуцца нажамі, назбіраецца больш пьяных і пачынаецца запраўдная вайна. Як вар'яты з крыкам, гвалтам лецяць на вуліцы, бьючы і абражаючы бруднымі словамі ўсіх, хто нарвецца. Нападаюць на дамы сваіх праціўнікаў, павыбіваюць вокны, пакалечаць сабе і другім твар, рукі, а далей — вядома — пратакол, суд і турма...

Жыць можна і ляпей, бо наўкола нас лясы і заробкаў хоць адбаўляй. Але на што гэтыя заробкі йдуць? Мо на што добрае, карыснае? Да барані, Божа! Усё-ж на гэтую сьмярдзючую гарэлку, і гарэлку, і толькі гарэлку... А як былі цемра, гора і бядота, так і далей гуляюць у нас сабе прыпяваючы. Праўда ёсьць і ў нас не адзінкі, а меньшая палова моладзі, якая імкнецца да сьвету, да культуры, да лепшага жыцьця. Імкнецца также дапамагчы і выцягнуць з цемры і нядолі сваіх цёмных братоў—сялян. Але дарога надта цярністая. Але сьвядомасьць, праца і моцная воля іх усё пераможа. Я веру ў гэта моцна. Гэта моладзь ужо заложыла ў сваёй в. Морачы гурток „Прасьветы", лік сяброў у якім павялічываецца са дня на дзень, адкрыла бібліатэку—чытальню і шпарка йдзе далей ў кірунку пашырэньня асьветы. Дарога пракладзена. Дык браты—сяляне! Дакуль вы будзеце заліваць гарэлкай свой розум, свае сумленьне, ганьбячы свой гонар, свой людзкі воблік? Пашануйце сябе, дык і вас будуць шанаваць! Ведайце, што ніхто ня дасьць вам лепшай долі, калі вы самі аб гэтым не паруліцеся. А ў гэтым вам дапамогуць вашы калегі, дапаможа наш гурток „Прасьветы". Дык, родныя сяляне, ўсе да прасьветы, да працы за лепшую будучыню, за лепшую долю, за сьвет культуры!

Хай бацькі стагналі ўчора, йшлі на той сьвет без пары; сяньня ў нашай моцы гора, мы жыцьця гаспадары!"

„Дык наперад, пакуль сэрца б'ецца, рвецца на прастор! Годзе млеці ў паневерцы! Гэй да сонца! Гэй да зор"!

30 сьнежня, 1927 г.

Рыгор Рудко, з Морачы.

Войт страшыць.

(*м. Астрын, Лідзкага пав.*)

Даўно ўжо нашыя сяляне адчувалі патрэбу адчыніць у сяле беларускаю школу. Бо зразумелі, якую карысьць дае нам школа польская. Нашых дзетак прымушваюц хадзіць у польскую школу і за тры гады вучэньня ня ўмеюць нават напісаць свае прозьвішча. Па беларуску так сама, бо хаця-ж і ёсьць у нас „беларуская" вучыцелька, але яма сама ня ўмее па беларуску і вучыцца дзяцей гаварыць. Яе да нас прыслалі з Пазнані ці адкуль няведама. І вось гэтая Вера Крупэвісуўна, вучыцелька беларускіх дзетак так вучыць па баларуску, што за 2 гады не навучыла нават чытаць па беларуску. А дзе-ж нашыя вучыцялі, якія скончылі настаўніцкія курсы і атрымалі матуру на беларускіх вучыцялёў? Іх загналі туды, дзе ні аднэй душы беларускай няма.

Пачуўшы з газэт, што ў другіх мястэчках і вёсках шмат ужо адчынена беларускіх школ і нашыя сяляне пачалі складаць дэкляроцыі на беларускую ўрадовую школу. Падпісалі дэклярацыі і панясьлі да войта А. Якубовіча пасьведчыць. Дык ён пачаў страшыць, гаворачы: вас будуць за гэта вешаць. Але нашыя сяляне не спалохаліся, і далей складаюць дэклярацыі.

Дык сьмела да працы! Ня бойцеся, што вас войты такія, як А. Якубовіч страшаць вісельніцай. Бо дзякуючы толькі дэклярацыям адчынена на Беларусі 21 беларуская школа.

В. Д.

22-XII 1927 г.

Каго выбіраць?

(*Наваградчына*).

Сяляне пачынаюць цікавіцца выбарамі ў Сойм. Кожны вечар толькі і гутаркі, як аб выбарах і каго выбіраць. Каго выбіраць? Вось загвоздка, якая засела ў галаву сяляніна—беларуса. Чуў ён ужо, а здаецца цемны, аб „Блёку меньшасьцяў", аб Краёвым „Związku",— гэтых Бабілонскіх вежах. Можа хочаце ведаць, што кажа ён аб гэтых „Związkach" і „Блёках?" А кажа вось што: „Двом панам цяжка ўслужыць, а там, дык трох, ці больш, дзе-ж на іх угодзіш? Не, як урадзіўся беларусам, дык і паміраць ім і за яго„. Так-та, паночкі! Падальш ад „Związków" і „Блёкаў"!

Сьвядомы Беларус.

2 студзеня, 1928 г.

Гучны зьезд „Бызваленьня".

(*Нясьвіж*).

На 11 г.м. „Вызваленьне" склікала зьезд, з дэлегатаў, дзеячоў і мужоў даверра з пав. Нясьвіскага. Арганізатар зьезду Янка Клімак прыбыў за два дні раней і ўсё чакаў прыбыцьця запрошаных гасьцей, але прасядзеў у заезьдзе „Варшаўскім" цэлы дзень, алі ніхто да яго не зьяўляўся п. Клімэк перамяніў кватэру, шукаючы шчасьця, і памясьціўся ў заезьдзе кульгавага Бэркі.

Але і той аказаўся нешчасьлівым, бо ў дзень зьезду на салі зьезду апынуўся... толькі сам арганізатар „Вызваленец" Янка Клімэк і зайшлі дзеля інтэрэса яшчэ тры сьвядомыя беларусы радныя, з якіх Клімэк і хацеў рабіць зьезд. Але яны сказалі, што прыйшлі толькі пацікавіцца зьездам, а не рабіць дык п. Клімэк, уздыхнуўшы, запытаўся: „Cóż robić"? — „A nic!" На гэтым зьезд і закончыўся. Пасядзеў наш „Вызваленец" у разьбітага карыта, паплакаў і паехаў туды, адкуль прыехаў...

Так-та, паны „Вызваленцы!" Гэта Вам, не 1922 год. Цяпер наш народ добра сьвядомы і не паверыць„ у вашы абяцанкі. А ў сваю чаргу замест вашай абяцанкі у 22 годзе „зямлі і волі", шлець цяпер адказ „ліхой волі, долі", паны „Вызволенцы!"

Зацікаўлены.

Паштовая скрынка.

С. Сонько. — Газэта Вам высылаецца. Не атрымліваеце можа па віне пошты, дзе і навядзіце спраўку.

Язэп Крот, В. Дубенка, М. Рынкевіч. Ян Кондратаў, Максім Лобавіч, П. Вараноўскі, Р. Пецько, І. Лукяненак, М. Козянюк, Я. Цыпрыц, М. Яфімовіч, Я. Хомчык, П. Цупё, П. Маціновіч, Ул. Урбановіч. — Газэта высылаецца

Атрыманы грошы ад: В. Міцко — 1 зл. Я. Купрыновіча — 1 зл. М. Кульбака — 2 зл. — Газэта высылаецца.

Адказны Рэдактар Т. Вернікоўскі. Друк. І. Баеўскага Вільня, Мостовая 9. Выдавец Беларуская Нацыянальная Рада.